# § 4. Накіраванасць асобы

## Свет + погляд = светапогляд?




**Светапогляд і яго роля ў жыцці чалавека.** *Накіраванасць асобы* — гэта даволі шырокае паняцце, якое характарызуе ўнутраныя асновы чалавечай дзейнасці і яе змест. Пад унутранымі асновамі прынята разумець жаданні, патрэбы, матывы, мэты, інтарэсы, установкі людзей, але асаблівае месца сярод іх адводзіцца светапогляду чалавека.

**Светапогляд** — гэта сукупнасць поглядаў, ацэначных меркаванняў і вобразных уяўленняў пра свет, грамадства, чалавека і яго прызначэнне. Светапогляд людзей, якія жывуць у адным і тым жа грамадстве, адрозніваецца. Ён залежыць ад умоў фарміравання асобы, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, адукацыі і іншых фактараў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Часам светапогляд вызначаюць як сукупнасць найважнейшых перакананняў чалавека. Перакананне — гэта эмацыйны стан, устойлівая псіхалагічная ўстаноўка, упэўненасць чалавека ў справядлівасці сваіх поглядаў. У механізмах фарміравання перакананняў разам з ведамі і каштоўнасцямі найважнейшую ролю адыгрывае і валявы кампанент — здольнасць або гатоўнасць увасобіць у жыццё засвоеныя веды, каштоўнасці і ідэалы.**



Філосаф Казімір Лышчынскі прытрымліваўся атэістычных поглядаў, якія ён выклаў у сваім трактаце «Аб неіснаванні бога» (лац. De non existentia Dei). За гэты твор філосаф быў асуджаны і пакараны смерцю ў 1689 г.

Сёння жыццё ў большасці еўрапейскіх краін заснавана менавіта на тых свецкіх прынцыпах, якія выказвалі Казімір Лышчынскі, Галілеа Галілей, Джардана Бруна.

Прывядзіце прыклады вядомых вам асоб, чые погляды апярэджвалі свой час. Абмяркуйце, які ўплыў гэтыя асобы аказалі на сваіх сучаснікаў і нашчадкаў. ■

**Фарміраванне поглядаў чалавека на свет адбываецца на аснове яго жыццёвага вопыту. У гэтым працэсе спалучаюцца светаадчуванне, светаўспрыманне і светаразуменне, якія непарыўна звязаны, узаемна дапаўняюць адно другое, утвараючы цэласны вобраз свету і вызначаючы ў ім месца чалавека.**

## Фарміраванне светапогляду

| Светаадчуванне і светаўспрыманне | Светаразуменне |
| --- | --- |
| Эмацыйна-псіхалагічны складнік светапогляду, які мае на ўвазе стварэнне вобразнай карціны рэальнасці. Уключае эмоцыі, пачуцці і ўяўленні | Пазнавальна-інтэлектуальны складнік, які мае на ўвазе асэнсаванне і тлумачэнне рэчаіснасці. Уключае веды, перакананні, каштоўнасці |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вылучаюць два асноўныя тыпы светапогляду. Па-першае, светапогляд як сістэматызаваная сукупнасць поглядаў, ацэнак і ідэалаў (навуковы, філасофскі і рэлігійны светапогляд). Па-другое, жыццёва практычны (штодзённы) светапогляд, які ўласцівы звычайным людзям і мае шэраг адметнасцей.

Штодзённы светапогляд фарміруецца на аснове жыццёвага вопыту канкрэтнага чалавека і ў значнай ступені выяўляе яго асабістыя ўяўленні пра свет, умовы жыцця, жыццёвыя перспектывы, поспехі і няўдачы. Гэтаму віду светапогляду ў многім уласціва няўстойлівасць, часам супярэчлівасць і эмацыйнасць поглядаў і ацэнак. Напрыклад, ад чаго залежыць, які погляд на свет сфарміруецца ў чалавека — аптымістычны або песімістычны?

**Шклянка з вадой напалову поўная або напалову пустая?**

| **Аптымізм**<br>(ад лац. *optĭmus* — найлепшы) | **Песімізм**<br>(ад лац. *pessĭmus* — найгоршы) |
|---|---|
| Погляд на жыццё са станоўчага пункту погляду, упэўненасць у лепшай будучыні. Аптыміст лічыць няўдачы выпадковымі і непастаяннымі ў часе, а станоўчыя падзеі — заканамернымі і натуральнымі | Адмоўны, негатыўны погляд на жыццё. Песіміст лічыць няўдачы справай звычайнай, а станоўчыя падзеі — выпадковымі, ніяк не звязанымі з яго вартасцямі і заслугамі |



Якім чынам адказ на пытанне «Шклянка напалову поўная або напалову пустая?» звязаны з адносінамі чалавека да навакольнага свету ў цэлым альбо да канкрэтнай сітуацыі ў прыватнасці? Які адказ лічыцца адказам аптыміста, а які — песіміста?

Светапогляд чалавека можа змяняцца з часам. Даследаванні беларускіх сацыёлагаў паказваюць, што светапогляд мае своеасаблівыя рысы ў розных узроставых групах насельніцтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Як з узростам змяняецца светапогляд чалавека?**

- Маладыя людзі больш за іншых упэўнены ў сабе і чаканым жыццёвым поспеху. У іх найбольш шырокае кола сяброў. Яны больш за прадстаўнікоў іншых узроставых груп спадзяюцца на свой адукацыйны ўзровень, а работа часцей прываблівае іх магчымасцю самарэалізацыі. Таксама ў маладых людзей пераважае арыентацыя на прафесійнае самавызначэнне і пошук блізкага чалавека.
- Прадстаўнікі сярэдняй узроставай групы больш рэалістычна ставяцца да сваіх жыццёвых перспектыў і ў большай ступені спадзяюцца на свае прафесійныя і дзелавыя якасці, якія павінны прывесці да практычнага выніку, радзей чакаюць ад работы ўмоў для самарэалізацыі. Наяўнасць сям'і звужвае кола сяброў, а ў цэнтры ўвагі аказваюцца дзеці, іх выхаванне, жыццёвы і матэрыяльны дабрабыт.
- Людзі старэйшага пакалення часцей арыентуюцца на назапашаны жыццёвы вопыт і мудрэй ставяцца да жыцця. Яны больш цэняць грамадскае прызнанне і павагу іншых людзей. Кола сяброў у іх асяроддзі працягвае звужвацца, але сувязі паміж імі становяцца мацнейшымі. Са спыненнем актыўнай прафесійнай кар'еры яны імкнуцца знайсці сабе іншыя цікавыя віды дзейнасці. Са з'яўленнем унукаў многія кажуць пра адкрыццё другога дыхання.

Ці згодны вы з гэтымі сцвярджэннямі? Аргументуйце свой пункт погляду.









Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Духоўны свет асобы.** Светапогляд чалавека з’яўляецца асновай яго духоўнага свету. Ключавую ролю ў вызначэнні накіраванасці асобы і яе светапогляду адыгрывае сэнс жыцця, які выбірае чалавек.

*Сэнс жыцця* — гэта тое, што акрэслівае прызначэнне і канчатковую мэту чалавечага існавання, надае контуры цэльнасці жыццёваму шляху. Ён фарміруецца на аснове каштоўнасцей, найбольш значных, важных для чалавека ў яго жыцці. Сэнсаў жыцця можа быць некалькі. Тады яны выстройваюцца для чалавека ў пэўную каштоўнасную іерархію, галоўны выбар з якой часта зрабіць няпроста.

**Як заставацца чалавекам у самым цяжкім становішчы?**

На думку аўстрыйскага вучонага Віктара Франкла, барацьба за сэнс жыцця з’яўляецца асноўнай рухальнай сілай чалавека. Сэнс жыцця для кожнага ўнікальны. У кожнага чалавека сваё прызначэнне. Таму важны не сэнс жыцця наогул, а, хутчэй, сэнс жыцця канкрэтнай асобы ў пэўны адрэзак часу.

Франкл лічыў, што існуюць тры асноўныя шляхі, якія могуць дапамагчы чалавеку знайсці сэнс у жыцці. Першы — што ён дае свету плёнам сваёй дзейнасці. Другі — што бярэ ад свету ў сваіх сустрэчах і перажываннях. Трэці — пазіцыя, якую ён займае ў адносінах да свайго цяжкага становішча ў тым выпадку, калі не можа змяніць свой лёс, як гэта адбылося з самім Франклам, які апынуўся ў канцэнтрацыйным лагеры. Вучоны выжыў таму, што знайшоў сэнс жыцця ў аказанні псіхалагічнай дапамогі і падтрымкі іншым вязням.

Такім чынам, наглядным прыкладам духоўнага свету чалавека, сэнс жыцця якога выходзіць за межы накіраванасці толькі на самога сябе, з’яўляюцца ўчынкі на карысць іншых людзей. Бескарыслівая дапамога, клопат пра дабрабыт іншых людзей называецца *альтруізмам*. Часам, асабліва ў экстрэмальных сітуацыях, такі чалавек дзейнічае, ахвяруючы ўласнымі інтарэсамі, рызыкуючы здароўем і нават самім жыццём.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

15-гадовы мінчанін Віталь Цітоў 28 кастрычніка 2017 г. скокнуў у халодную ваду Свіслачы дзеля выратавання дзіцяці, якое танула.

Што вы хацелі б спытаць у маладога чалавека, калі б была магчымасць узяць у яго інтэрв'ю? Чаму?

Прывядзіце прыклады вядомых вам выпадкаў падобных учынкаў.



Вывучэнне жыццёвых сэнсаў сучасных грамадзян Беларусі дазваляе вылучыць асноўныя з іх. Згодна з вынікамі даследаванняў, заснаванымі на прызнанні саміх людзей, гэта перш за ўсё сям'я, дзеці, здароўе, работа, вучоба, кола сяброў.

**Якія жыццёвыя каштоўнасці мы выбіраем?**

Азнаёмцеся з жыццёвымі каштоўнасцямі па ўводнай інфаграфіцы. Дапоўніце пералік каштоўнасцей пры неабходнасці.

- Выберыце тры найбольш важныя, на вашу думку, каштоўнасці. Параўнайце свой выбар з выбарам аднакласнікаў.
- Якія тры каштоўнасці сталі найбольш папулярнымі ў вашым класе, а якія тры — найменш? Чым можна растлумачыць такі каштоўнасны рэйтынг?
- Правядзіце апытанне іншых узроставых груп. У чым праяўляецца адрозненне ў каштоўнасцях, а што з'яўляецца агульным?

Такім чынам, духоўны свет асобы — гэта ўнутраны свет чалавека, цэласная і ў той жа час супярэчлівая з'ява. Гэта складаная сістэма, элементамі якой з'яўляюцца эмоцыі і пачуцці, веды і перакананні, мэты і каштоўнасці, што ляжаць у аснове стаўлення чалавека да свету і самога сябе, надаюць сэнс яго дзейнасці.

**Бездухоўнасць і яе прычыны.** Найважнейшай праявай духоўнасці з'яўляецца прытрымліванне маральных асноў сумеснага чалавечага жыцця. Іх грубае ігнараванне і прамое парушэнне прыводзяць да бездухоўнасці. *Бездухоўнасць* уяўляе сабой прамы вынік



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

эгаістычнасці чалавека, антыгуманнага характару мэт, якія ён ставіць перад сабой, і сродкаў, выкарыстоўваючы якія імкнецца дасягнуць гэтых мэт.

Эгаістычнасць чалавека праяўляецца ў празмернай накіраванасці асобы на сябе, засяроджанасці толькі на ўласных інтарэсах і няздольнасці ўлічваць інтарэсы і пункт погляду іншых людзей.







Якія праблемы эгаістычных і безадказных паводзінаў людзей у розных краінах уздымае сацыяльная рэклама — некамерцыйная рэклама, што мае на мэце прыцягненне ўвагі да негатыўных з'яў жыцця грамадства?

Знайдзіце ў Сеціве і зрабіце падборку сацыяльнай рэкламы, што заклікае да пераадолення адмоўных з'яў сучаснасці.

Крайнімі формамі праявы бездухоўнасці з'яўляюцца антыграмадскія дзеянні, сярод якіх найбольш асуджаюцца крымінальныя злачынствы і хуліганскія дзеянні, культурны вандалізм (знішчэнне гістарычных і культурных каштоўнасцей і святынь), варварскія адносіны да прыроды. У падлеткавым асяроддзі — гэта гвалт і здзек з аднагодкаў або малодшых па ўзросце дзяцей, праявы злосці, зайздрасці і нянавісці ў адносінах да іншых.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Растлумачце, што такое светапогляд і якая яго роля ў жыцці чалавека.
2. Прывядзіце прыклады аптымістычнага і песімістычнага стаўлення да жыцця.
3. Прыкладам якой накіраванасці асобы з'яўляецца надпіс, які пакінулі нам 20 ліпеня 1941 г. абаронцы Брэсцкай крэпасці: «Я умираю, но не сдаюсь! Прощай, Родина»? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
4. Для ўсведамлення розных асноў сэнсу жыцця беларусаў падчас аднаго з даследаванняў вучоныя задалі пытанне: «Што азначае для Вас багацце?» Прааналізуйце табліцу. Адкажыце на пытанні: з чым асацыіруецца багацце ў большасці людзей? якія каштоўнасці пераважаюць у большасці людзей — матэрыяльныя або духоўныя? чаму вы так думаеце? ■

| № | Адказы на пытанне: «Што азначае для Вас багацце?» | Колькасць адказаў, % |
|---|---|---|
| 1 | Упэўненасць у будучыні | 72,7 |
| 2 | Магчымасць дапамагаць блізкім | 65,3 |
| 3 | Высокааплатная работа | 64,7 |
| 4 | Магчымасць падарожнічаць | 58,1 |
| 5 | Наяўнасць прыбытковай справы | 36,3 |
| 6 | Магчымасць жыць там, дзе хочацца | 32,2 |
| 7 | Наяўнасць жылля | 30,7 |
| 8 | Наяўнасць дарагой машыны, мэблі, адзення | 24,0 |
| 9 | Магчымасць рабіць ахвяраванні | 16,2 |
| 10 | Наяўнасць рахунку ў замежным банку | 15,9 |
| 11 | Наяўнасць каштоўных папер | 14,1 |
| 12 | Наяўнасць валюты, каштоўнасцей | 12,8 |

Выканайце міні-праект «Калі яны былі маладыя». Стварыце падборку фотаздымкаў з сямейнага архіва, якія ілюструюць жыццёвыя каштоўнасці і перакананні вашых дзядуляў і бабуль у маладосці. Параўнайце з іх сённяшнімі поглядамі. Што змянілася, а што засталося нязменным? Выкарыстоўвайце памятку для аналізу фота. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне